УДК 331.105

# Калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін у Беларусі

Дубовік А. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Эфектыўнай формай удзелу працоўных калектываў у кіраванні прадпрыемствамі, магутным інструментам абароны правоў і законных інтарэсаў працуючых з'яўляецца калектыўны дагавор. Станаўленне калектыўных дагавораў, змена іх зместу і ролі адбывалася пад уплывам сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы і з'яўлялася адлюстраваннем гэтай палітыкі. Таму вялікую цікавасць мае вывучэнне гістарычнага вопыту калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін у Беларусі.

Калектыўна-дагаворная практыка ўзнікла і атрымала распаўсюджанне ў Беларусі ў пачатку НЭПа. Упершыню калектыўны дагавор быў заключаны ў лістападзе 1921 г. паміж прафсаюзам харчавікоў і Мінскім адзіным спажывецкім таварыствам у дачыненні да хлебапякарні апошняга, а не ў пачатку 1922 г. паміж прафсаюзам хімікаў і групавым упраўленнем шкляной прамысловасці, як сцвярджаецца ў літаратуры. Калектыўныя дагаворы і тарыфныя пагадненні, у якіх абумоўліваўся памер і тэрміны выплаты заработнай платы, абавязацельствы наймальнікаў па правядзенні мерапрыемстваў па ахове працы і іншыя пытанні, з'яўляліся важным інструментам абарончай дзейнасці прафсаюзаў. Яны садзейнічалі паляпшэнню ўмоў працы рабочых і служачых, зніжэнню колькасці працоўных канфліктаў. Калектыўныя дагаворы ўтрымлівалі ў сабе элементы сацыяльнага партнёрства, з'яўляліся адной з форм далучэння працоўных да кіравання вытворчасцю. Аднак на рубяжы 20–30-х гг. у эканамічнай і сацыяльна-працоўнай сферы канчаткова зацвердзіліся камандна-адміністрацыйныя метады кіравання, адбылося згортванне калектыўна-дагаворнай практыкі, што звузіла магчымасці ўдзелу прафсаюзаў у рэгуляванні працоўных адносін. З 1934 па 1946 г. калектыўныя дагаворы наогул не заключаліся. Пераважаў дзяржаўны патэрналізм у працоўных адносінах. Яны фарміраваліся дзяржавай, якая не толькі ўстанаўлівала правілы гульні, але і па сутнасці з'яўлялася адзіным працадаўцам.

Савецкі вопыт калектыўна-дагаворнай практыкі не страціў свайго значэння і можа быць выкарыстаны на сучасным этапе ў Рэспубліцы Беларусь з улікам сёняшніх рэалій рыначнай эканомікі. Сістэма распрацоўкі, заключэння і рэалізацыі калектыўных дагавораў і пагадненняў з'яўляецца нясучай канструкцыяй партнёрскіх узаемаадносін Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі з аб'яднаннямі наймальнікаў і органамі дзяржаўнага кіравання, заснаваных на прынцыпах сацыяльнага партнёрства.